МГПУ им. И.П.Шамякина

**УДК 821.161.3**

**Г. М. Дашкевіч (Мазыр, Беларусь)**

# ЖАНРАВЫЯ ПОШУКІ В. БЫКАВА Ў ТВОРАХ АПОШНІХ ГАДОЎ

*У артыкуле акцэнтуецца ўвага на тым, што пашырэнне тэматычнага плана ў творчасці В. Быкава апошніх гадоў яго жыцця цесна суадносіцца з пошукам самастойных, непракладзеных шляхоў у адлюстраванні рэчаіснасці. Своеасаблівым доказам творчай незаспакоенасці пісьменніка з'яўляецца зварот да распрацоўкі жанраў прытчы, прыпавесці, казкі для дарослых.*

В. Быкаў спрабаваў свае сілы ў розных жанрах прозы. Яго аповесці за своеасаблівую адметнасць сталі называцца ў нашай крытыцы быкаўскай разнавіднасцю жанру, міні-раманамі. Цікавіўся пісьменнік

драматургіяй і кінарэжысурай. Вялікае месца ў літаратурнай спадчыне В. Быкава ў апошні час займаюць публіцыстыка і публічныя выступленні, якія, на думку Ю. Залоскі, «і ёсць на сёння ці не галоўным полем бою мастака. Мастака – ужо – палітыка...» [1, 8].

Нельга не заўважыць, што на апошнім этапе свайго жыцця В. Быкаў аддае перавагу апавяданню, з якога звычайна пачынаюць празаікі сваю творчасць. І тут, на думку Д. Бугаёва, ёсць свая логіка. Бо В. Быкаў заўсёды імкнуўся «да максімальнай згушчанасці мастацкага пісьма, да яго высокай дакладнасці і, разам з тым, лаканічнасці. Апавяданне ж схіляе да гэтага. І таму яно так вабіць патрабавальных майстроў, якія больш за ўсё не любяць расцягнутай шматслоўнасці» [2, 14].

Жанравае спасціжэнне прозы В. Быкава – адно з самых цікавых і праблематычных пытанняў сучаснага беларускага літаратуразнаўства. Многія даследчыкі адзначалі ў творчасці пісьменніка элементы прытчавасці, але, як мяркуе А. Адамовіч, гэтыя думкі амаль што не маюць тэарэтычных доказаў, бо быкаўскай прозе ўласцівы сінтэз рэалістычнага і прытчавага пачаткаў. Таму даследчык і ўвёў паняцце «прытчападобнага» рэалізму.

З поўнай упэўненасцю можна сказаць, што прозе В. Быкава ўласціва экзістэнцыяльнае светаадчуванне, а галоўным атрыбутам экзістэнцыялізму з'яўляецца прытчавасць, якая заняла належнае месца ў творах пісьменніка. Яна адыгрывала значную ролю і ў ранніх творах В. Быкава, але ў апошнія гады стала яшчэ больш яркай і выразнай. Дакладным сведчаннем таму служыць яго апавяданне «Сцяна».

Як вядома, «прытча – невялікі павучальнага характару твор» [3, 12]. Галоўныя яе жанравыя асаблівасці ў свой час вызначыў Ф. Скарына. Беларускі першадрукар пад прытчай разумеў іншасказанне, дзе «пад звычайным апавяданнем хаваецца іншая мудрасць і навука», скрыта «мудрасць, як сіла ў дарагім камні, і золата ў пяску, і ядро ў арэху» [3, 12].

Прытча засяроджвае ўвагу чытача не так на вобразах, на форме, як на галоўнай ідэі: «мысліцельны, інтэлектуальны элемент пераважае ў ёй над вобразным» [3, 12]. Аўтара цікавіць не столькі паказ індывідуальных характараў, колькі выяўленне пэўнай філасофска-маральнай думкі. І тут вялікую ролю адыгрывае іншасказанне, сімволіка, алегарычнасць.

Таму Д. Бугаёў, аналізуючы апавяданне «Сцяна», сцвярджае, што «па сваёй жанравай разнавіднасці гэта прытча ў чыстым выглядзе. Яе безыменны герой жыве ў безыменнай краіне, у якой пануе жорсткая і доўгатэрміновая дыктатура. Яна і кінула яго ў адзіночную камеру каменнай турмы» [4, 19].

Абсурдная па сваёй прыродзе стрэсавая сітуацыя, калі чалавеку толькі ў самім сабе прыходзіцца шукаць сілы, каб супрацьстаяць бязлітасным абставінам, вобраз бясконцай, непарушнай турэмнай сцяны канцэнтруюць у сабе экзістэнцыйныя матывы многіх аповесцей В. Быкава.

Прытча па самой сваёй жанравай спецыфіцы вызначаецца вялікай шматзначнасцю і таму дапускае самыя розныя вытлумачэнні. У «Сцяне» В. Быкаў робіць спробу «алегарызаваць» нядаўняе мінулае, «гісторыю перабудовы і звязаныя з ёй надзеі, ...асвятляе адваротны вынік гісторыі» [5, 25].

Гэты твор па глыбіні паказу марнага супраціву ахвяры даволі блізкі да прытчы Я. Сіпакова «Клетка», да такіх твораў заходнееўрапейскай літаратуры, як «Сцяна» Ж. -П. Сартра, «У папраўчай калоніі», «Працэс» Ф. Кафкі, «Міф пра Сізіфа» А. Камю і інш. У кантэксце як беларускай, так і заходнееўрапейскай прозы жыццё ў клетцы, у мураваным склепе, закрытым ад усіх праяў нармальнага чалавечага жыцця, бессэнсоўнае для зажыва пахаваных пакутнікаў.

У 1928 годзе мастак выступіў у друку з цікавым, даволі незвычайным творам – прыпавесцю «Камень». Такая разнавіднасць жанру яшчэ не знайшла ў сучасным літаратуразнаўстве свайго строгага вызначэння. Таму ўклад В. Быкава ў развіцце і папулярызацыю гэтага жанру відавочны. У агульных рысах прыпавесць можна атаясаміць з прытчай.

Прыпавесць «Камень» някідкая, простая па сюжэту, што з'яўляецца характэрнай асаблівасцю быкаўскага пісьма. Людзі адной вёскі, якімі «авалодала калектывісцкая ідэя» [6, 3], вырашылі скаціць у прорву агромністы камень, які многім пакаленням не даваў спакойна жыць, бо ляжаў на схіле гары ў самым пачатку вуліцы. З-за яго «ніхто ў дамоўках ніжэй не мог спаць спакойна, дапяты пыганнем: ляжыць ці коціцца?» [6, 3] Але намаганні людзей прынеслі толькі шкоду, і каменная лава зруйнавала ўсю вуліцу.

Адметная рыса прыпавесці – безыменнаць усіх герояў. Гэта проста тракціршчык, вучыцель, пастух, каваль, малатар і іншыя, што, бясспрэчна, сведчыць аб тыповасці і вялікай абагульненасці вобразнай палітры твора. Аўтар не ўказвае і назву паселішча, дзе адбываюцца падзеі. Адно толькі вядома, што «ў гэтым горным краі камянёў было шмат...» [6, 3].

Дзеянне на працягу ўсяго расповеду абмежавана адным пэўным месцам – ад вяршыні гары да пачатку вуліцы, а таксама пэўным адрэзкам часу, разлічаным на адны суткі. Але гэта толькі знешняя абалонка твора, бо на самой справе ўсё значна глыбей і складаней. Часавыя межы прыпавесці «Камень» значна шырэйшыя. Тут ідзе гаворка амаль пра стагоддзе, калі не болей. Адлік часу пачаўся ў тракціры, дзе людзі вырашылі пазбавіцца каменнай пагрозы, і скончыўся зруйнаваннем вуліцы. Кожная хвіліна ў творы, кожны рух камня ўгару, кожная новая ахвяра адпавядаюць цэламу дзесяцігоддзю, пэўнаму рэальна гістарычнаму этапу як у далёкім, так і нядаўнім мінулым нашай краіны. Відавочна, што і пpасторавыя абсягі твора не абмяжоўваюцца толькі адным невялікім месцам.

Нельга не заўважыць, што ў прыпавесці «Камень» В. Быкаў адыходзіць ад свайго аблюбаванага і памайстэрску распрацаванага прыёму пашырэння часавых і прасторавых рамак твора за кошт рэтраспекцыі. Асвоіўшы гэты надзвычай складаны мастацкі прыём, узбагаціўшы яго сваім адметным стылем, магутны, неспакойны талент пісьменніка шукае новыя шляхі, новыя штрыхі творчага патэнцыялу.

Як відаць з твора, прыпавесць вызначаецца гарманічным спалучэннем рэальнага і фантастычнага, што не толькі не замінае адно другому, але дае вялікія магчымасці для глыбокага мысліцельна-філасофскага, абагульненага асэнсавання жыцця. Так, напрыклад, не выклікае сумнення рэальнасць падзей, адлюстраваных у творы. Не разыходзяцца з праўдай жыцця паводзіны людзей, іх учынкі і адпаведныя вынікі, што прывялі да жахлівага фіналу.

Элементам паяднання рэальнага і фантастычнага выступае ў прыпавесці вобраз каменя. Сама назва твора нясе вялікую сэнсавую нагрузку. Пісьменнік надзяляе неадухоўленую рэч сваім асабістым жыццём: камень можа рухацца, адчуваць, мысліць. Гэты камень «на сваім колішнім землятрусным шляху з гары затрымаўся якраз на пачатку вуліцы, нібы знерухомеўшы ў роздуме – каціцца далей ці пачакаць?»; «камень вырашаў тую праблему...»; «камень, хоць і з вялізным нежаданнем, зрушыў з свайго належанага за сотні год месца»; «...іншыя з усяе сілы трымалі камень, які ўпарта імкнуўся ўніз – да свайго



МГПУ им. И.П.Шамякина

належанага месца»; «клопат іх нібы зразумеў і камень, які варухнуўся на той раз жвавей, – бы самахоць пераваліўся на другі, болей пляскаты бок» [6, 3].

Тое, што камень быў жывой разумнай істотай, пацвярджаюць і адносіны людзей да яго. «Чаму гэта ён так імкнуўся туды? – думаў вучыцель. Хіба тое месца было вызначана яму Богам? Але тут ягоная матэматыка ўступала ў супярэчнасць з непазнана-містычным, у якім вучыцель быў поўны прафан, і разумеў тое» [6, 3].

Усе персанажы, вобразы, рэчы у прыпавесці нясуць значную сімвалічную нагрузку. У поўным сэнсе слова сімвалічны вобраз каменя, вакол якога разгортваюцца ўсе падзеі твора. Гэта сімвал рабства, беднасці, усіх чалавечых нягод, сімвал несправядлівага і нераўнапраўнага жыцця, якое пануе над лёсамі людзей. Спроба скінуць камень у прорву – гэта не што іншае, як бунт чалавека супраць ганебнага жыцця, адчайны пошук выйсця.

Шматзначны сэнс набывае ў прыпавесці і тракцір, месца, дзе быў пакладзены пачатак бунту, дзе ўпершыню прагучала «калектывісцкая ідэя, якая з часам набывае матэрыяльную сілу. Асабліва калі тая сіла натхніцца ў пэўны момант бочкаю добрага маладога віна» [6, 3].

Даволі глыбокі падтэкст крыецца і ў тым, што натхняў людзей на гэту справу тракціршчык. Гэта адзін з чатырох асноўных вобразаў-сімвалаў у прыпавесці, які дапаўняе вобразы каменя, вучыцеля і пастуха. Пісьменнік надае яму асаблівую ўвагу, выдзеліўшы ў тэксце асобным шрыфтам. В. Быкаў называе яго «гаспадаром-тракціршчыкам», адзначаючы, што ён «наогул лічыўся ў іх самым разумным, інакш бы ён і не быў тракціршчыкам» [6, 3]. Вобраз тракціршчыка – гэта не што іншае, як сімвал правадыра, які ўзяўся вывесці людзей да светлага будучага. Аўтарская іронія і невыносны, нясцерпны боль і горыч прабіваюцца праз кожны радок, кожнае слова, бо вялікая і высокагуманная ідэя зарадзілася менавіта ў тракціры, «з меднаю квартай у руцэ» [6, 3], а правадыром аказаўся «не надта цвярозы пасля вясёлай начы тракціршчык» [6, 3]. У выніку малапісьменнай грамадзе не пашчасціла «здзейсніць іх святы подзвіг на шчасце людзям». Атрымалася яшчэ горш: зруйнаванае паселішча і нікому не патрэбныя ахвяры.

Яшчэ адным з ключавых сімвалаў у прыпавесці з'яўляецца вобраз вучыцеля, які адзіны «спрабаваў штось зазначыць, удакладніць ці запярэчыць, але яго слухаць не сталі. Вучыцель быў не тутэйшы, да таго ж малады, піў мала, відаць, ашчаджаў грошы, што не надта каму падабалася» [6, 3]. Толькі вучыцель усведамляў усю марнасць справы, бо прадбачыў, што «паводле законаў матэматыкі тое было немагчыма... Меркаванні здаровага сэнсу таксама былі не на іхнім баку...» [6, 3]. Вучыцель сімвалізуе ў творы інтэлігенцыю, якая разумела ўсю безнадзейнасць сітуацыі, бо шлях да высокай мэты быў выбраны памылковы і ў рэшце рэшт прывёў у тупік. Але В. Быкаў паказвае, што і інтэлігенцыя таксама паддалася гэтай апантанай утапічнай ідэі: «Вучыцель, прадаўжаючы сумнявацца, убачыў такую актыўнасць і таксама міжволі прыняў удзел у агульным клопаце» [6, 3].

Апошнім ключавым сімвалам з'яўляецца вобраз пастуха, якога мы першы раз бачым з квартай у руцэ. Пастух у прыпавесці – гэта сімвал сялянства.

Сімвалічным з'яўляецца і тое, што адзіныя, хто застаўся на схіле пасля таго, як «неўзабаве каменная лава магутна абрушылася на крайнія збудоўкі паселішча, кузню, зламала палову таполі і праз момант накрыла ўсю вуліцу чорна-пыльнаю хмарай[6, 3], былі тракціршчык, вучыцель і пастух. «Трохі ачуняўшы ад першага жаху, вучыцель падумаў, што, мабыць, цудаў у наш век не бывае. Здараецца тое, што і павінна здарыцца – паводле законаў жыцця. Калі толькі з імі лічыцца. Ды во, пэўна ж,не палічыліся» [6, 3]. – спрабуе ўсё асэнсаваць, зрабіць адпаведныя вынікі герой твора.

Як заўжды, героям В. Быкава зноў не пашанцавала. Прыпавесць «Камень» напоўнілася яшчэ большай псіхалагічнай завостранасцю і трагізмам. Колькасць чалавечых ахвяр, загінуўшых марна, бяздумна, узрастае. Гэта яшчэ больш заглыбляе драматызм твораў пісьменніка, моцна знітаваных з драматычнымі калізіямі жыцця. Аб гэтым сведчыць жахлівы, песімістычны фінал «Каменя»: «А ўнізе тым часам разносіўся ветрам глухі невыразны лямант бяды, які на адлегласці зліваўся ў суцэльны працяглы стогн...» [6, 3].

Міжволі напрошваецца думка аб тым, што прыпавесць адрозніваецца ад іншых жанравых разнавіднасцяў празаічнай літаратуры не толькі спецыфікай пісьма, стылю, шматграннасцю сімволікі, але і непаўторнай інтанацыяй, запаволенасцю тэмпу. Такое ўражанне ўзнікае пасля азнаямлення з творам В. Быкава. Перачытаем пачатак прыпавесці, першы абзац. Ён вызначаецца няспешнасцю, урачыстасцю апавядання: «Зранку таго дня ў тракціры стрымана гуло; гуло ў паўдзён і ўвечары гуло таксама. Зрэшты, для таго былі прычыны: скончыўся палявы сезон, людзі сабралі ўраджай, частку якога з выгадай прадалі на кірмашы, а частку захавалі на зімку. Шмат хто займеў грошы – чаму было і не пагудзець у вольны пасля плённае працы час? Пасля плённае працы льга было і зусім расслабіцца, забыцца на руцінныя клопаты, піць маладое віно ды спяваць песні» [6, 3]. Быкаўскі твор насычаны словамі простанароднай, песенна-былiннай лексікі, характэрнай для былін і казак паслядоўнасцю.

У сучаснай казцы для дарослых «Хвастаты» яскрава адчуваецца, што пісьменнік робіць спробу распрацоўкі абсалютна новага для сябе жанру.

Нагадаем, што казка – гэта «жанр вуснай народнай творчасці, звычайна празаічнае апавяданне фантастычнага або сацыяльна-бытавога зместу з шырокім выкарыстаннем вымыслу (выдумкі)» [3, 70]. Пісьменнікі часта звярталіся да жанру казкі, тым самым уносячы свой уклад у яе развіццё і ўзбагачэнне. Не абышоў сваёй увагай казку і В. Быкаў. Галоўны герой казкі «Хвастаты» – пацук «разважлівы, ... самы дужы, самы смелы пацук на складзе, ... пацук-пераможца, пацук-лідэр» [7, 4]. У творы даюцца цэлыя малюнкі «пацучынага грамадства», дзе ў барацьбе за існаванне «гінуць самыя вартыя і самыя годныя. У той жа час астатнія, дурныя і баязлівыя, будуць жыць і смяяцца з яго. Але, мабыць, такая ўжо іх пацучыная прырода» [7, 4].

Вельмі сімвалічны і шматзначны эпізод, калі восем пацукоў, сярод якіх апынуўся і Хвастаты, аказаліся ў пастцы, якую загадзя падрыхтаваў Вусаты і малады грузчык Белабрысы. «У жалезнай бочцы ўтварыўся вірлівы шмуток з целаў ахопленых жахам пацукоў, якія ірвалі, грызлі, тапталі адзін аднаго, – нападалі і абараняліся адначасна. У бочцы надта патыхала крывёй, і ў яе паху зусім патануў нядаўна яшчэ жаданы пах сыру» [7, 4].

Пры дапамозе алегорыі В. Быкаў перадае ў казцы ўсю жудасную сутнасць барацьбы за існаванне, барацьбы беспрынцыповай, калі ўсё трымаецца на сіле, на страху. Пісьменнік з вялікім майстэрствам адлюстроўвае сістэму пераараджэння, «рэінкарнацыі» наадварот, падмены прыроднай сутнасці чалавека, якая закладзена з самага нараджэння Богам, на антычалавечую, антыгуманную.

Напачатку Хвастаты быў упэўнены, што галоўны пацукоў вораг – «чалавек... яго перамагчы немагчыма» [7, 4]. Але ўжо ў фінале апавядання чалавек – «яго Бог і

МГПУ им. И.П. Шамякина

праўда» [7, 4]. У чым жа справа? Чаму так рэзка мяняюцца маральныя арыенціры пацука? Справа вельмі простая. Галоўнае – правільна выбраны метад. Дзяржаўная машына папоўніцца яшчэ адным адданым, бяздумным салдатам, які будзе абараняць гэтую машыну любымі сродкамі, не дбаючы ні пра каго і ні пра што. «Аказваецца, той зусім не кепскі, – разважае пацук пра Вусатага. – Той – добры. Той яго паратуе. Гэта ягоныя суродзічы-пацукі спрабавалі яго забіць, а чалавек яму дорыць жыццё. Які ж ён быў дасюль дурань, што ненавідзеў людзей!» [7, 4]. Праз месяц на складзе не засталося ніводнага пацука, акрамя Хвастатага, якога ўжо не хваляваў пах сыру, а толькі пах крыві.

На такой песімістычнай ноце заканчвае В. Быкаў сваю казку. Дарэчы будзе нагадаць тут словы Ю. Залоскі: «Мастак – палітык кліча на паўстанне – супраць антырэаліяў, якія за дзесяцігоддзі разрасліся да памераў астранамічных, увайшлі ў нашу плоць і кроў, сталіся нябачнай часткай нашых істот і душаў. Ці пачуем гэты зычны голас Быкава-суддзі; ці, можа, і на гэты раз спраўдзіцца – у каторы ўжо раз на Зямлі пакут – біблейскае «няма прарока ў сваёй Айчыне?» [1, 8].

Жанрава-стылёвы спектр В. Быкава няспынна ўзбагачаецца. Прытчападобнасць як стыль, як алегарычнае адлюстраванне жыцця існавала ў творах беларускага празаіка заўсёды. Ахвярныя подзвігі настаўніка Мароза, Сотнікава нагадваюць евангельскую прыпавесць пра Хрыста.

Галоўным знакам бяды ў аднайменнай аповесці, сімвалам пакутніцтва з'яўляецца крыж. Пантрагедыйныя назвы твораў («Абеліск», «Знак бяды», «Воўчая зграя», «Сцюжа», «Сцяна» і іншых) таксама з'яўляюцца яскравым доказам шматзначнасці быкаўскай прозы, канцэнтруючы ў сабе інфармацыю сімвалічнага характару аб жорсткай прадвызначанасці лёсу герояў.

Узмоцненая прытчападобнасць, сімвалічная прытчавасць, якая назіраецца ў творчасці В. Быкава апошняга дзесяцігоддзя, – сведчанне моцнай пульсацыі экзістэнцыяльнай думкі пісьменніка, якая ствараецца дзякуючы выкарыстанню як міфалагічна-казачнай сімволікі, так і рэалістычных вобразаў-сімвалаў. У парабалічнай прытчы «Сцяна», прыпавесці «Камень», казцы «Хвастаты» статус сімвалізацыі набываюць інтанацыя, колеравая, пейзажная гама твора. У В. Быкава пераважаюць змрочныя, цёмныя фарбы, якія прадвызначаюць трагічную наканаванасць персанажаў, аддадзеных на згубу злой сілы.

Мастацкая адметнасць быкаўскіх твораў у іх інтэлектуальна-філасофскім спасцiжэнні трагічных калізій жыцця ў кантэксце як нацыянальнай, так і заходнееўрапейскай прозы. Бясспрэчна, што гэтае пытанне патрабуе асобнага разгляду.

**Літаратура**


1. Залоска, Ю. У эпіцэнтры: Спроба эзатэрычнага прачытання прозы В. Быкава / Ю. Залоска // ЛіМ. – 1994. – 17 чэрвеня.
2. Бугаёў, Д. Шматзначная ёмістасць апавядання: Пра новы твор Васіля Быкава (Апавяданне «Труба») / Д. Бугаёў // Роднае слова. – 1999. – №1. – С. 13–21.
3. Лазарук, М. А., Ленсу, А. Я. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: Дапам. для настаўніка. – Мінск: Нар. асвета, 1983. – 191 с.
4. Бугаёў, Д. Несуцяшальны дыягназ: Новыя творы Васіля Быкава / Д. Бугаёў // Роднае слова. – 1995. – №12. – С. 11–21.
5. Локун, В. Літаратура і свабода выбару: (Экзістэнцыяльныя накірункі творчасці В. Быкава / В. Локун //Полымя. – 1998. – №5. – С. 238–255.
6. Быкаў, В. Камень / В. Быкаў // Народная воля. – 1998. – 4 снежня.
7. Быкаў, В. Хвастаты / В. Быкаў // Народная воля. – 1998. – 3 верасня.


МГПУ им. И.П. Шамякина